1 красавіка 2016 г. на юрыдычным факультэце адбыўся Рэспубліканскі навукова-практычны круглы стол на тэму “Статут Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага: да 450-годдзя выдання”. Выступілі навукоўцы з розных вышэйшых навучальных устаноў краіны: доктар юрыдычных навук, прафесар Доўнар Т.І., доктар юрыдычных навук, прафесар Бібіла В.М., загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Калінін С.А., кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Шырынскі А.Ю. (усе з юрыдычнага факультэта БДУ), кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вішнеўская І.У. з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, профессор кафедры міжнароднага права Міжнароднага ўніверсітэта « МІПСА », кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Калініна Э.А., ст. навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры НАН Беларусі, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Дзербіна Г.В., загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Шчэрбік Дз.В. і інш.

Абмяркоўваліся актуальныя пытанні, прысвечаныя прычынам і перадумовам прыняцця Статута, яго агульнай характарыстыцы, эвалюцыі асобных нормаў і інстытутаў, прававому становішчу насельніцтва, значэнню, ролі і месцу Статута ў гістарычным развіцці права, прававой культуры грамадства, а таксама сучасным тэарэтыка-прававым праблемным пытанням развіцця дзяржавы і права.

Усяго прысутнічала каля 30 навукоўцаў. Матэрыялы круглага стала задэпаніраваны ў БДУ 31. 03. 2016 г., № 002831032016.

Кандыдат юрыдычных навук,
дацэнт — Л. Л. Голубева